# *§ 12–0. Развіццё сельскай гаспадаркі Беларусі ў XIX — пачатку XX ст.

**СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА СЕЛЯНІН**
**ЗЕМЛЕЎЛАДАННЕ РЭФОРМА**
**П. Д. КІСЯЛЁЎ ЛЮСТРАЦЫЯ**
**ІНВЕНТАР ПРЫГОННАЕ ПРАВА**
**П. А. СТАЛЫПІН**
**ПАНШЧЫНА ЧЫНШ**
**УСТАЎНАЯ ГРАМАТА**

**1. Сельская гаспадарка ў першай палове XIX ст.** У першай палове XIX ст. эканоміка Беларусі, як і ўсёй Расійскай імперыі, характарызавалася функцыянаваннем *прыгонніцкай сістэмы*. Зямля працягвала заставацца асноўным сродкам вытворчасці. Уладальнікамі зямлі былі не толькі памешчыкі, але і дзяржава, царква. У Беларусі пераважала буйнамаёнткавае дваранскае землеўладанне. Важнай характарыстыкай аграрнага сектара ў канцы XVIII — пачатку XIX ст. з’яўлялася павелічэнне колькасці рускіх землеўладальнікаў.

Беларусь была аграрным рэгіёнам. Асноўны даход давала прадукцыя сельскай гаспадаркі. Асновай яе былі збожжавыя культуры, павялічваліся пасевы бульбы і цукровых буракоў, вырошчваліся лён і каноплі. У жывёлагадоўлі ў першай палове XIX ст. пашырэнне атрымала танкарунная авечкагадоўля. Памешчыцкія гаспадаркі былі арыентаваны на рынак. Пачыналі выкарыстоўвацца перадавыя метады гаспадарання (сельскагаспадарчая тэхніка, шматпольны севазварот і да т. п.), аднак існаванне феадальна-паншчыннай сістэмы тармазіла развіццё капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы Беларусі.

**Асноўныя рысы сельскай гаспадаркі Беларусі**

Успомніце прыкметы прыгонніцкай сістэмы гаспадаркі.

## Становішча сялян

Асноўнай вытворчай сілай у аграрным сектары працягвалі заставацца прыгонныя сяляне. Асновай сялянскай гаспадаркі з'яўляўся зямельны надзел, за які яны мусілі адбываць *паншчыну* або плаціць *чынш*. Акрамя асноўных на плечы сялян клалася кола дадатковых павіннасцей і збораў. Дзяржаўныя сяляне плацілі падаткі дзяржаве. Становішча іх ускладнялася тым, што землі дзяржавы часцяком здаваліся ў арэнду, а часовыя ўладальнікі-арандатары ўсталёўвалі нярэдка высокія зборы, пераводзілі сялян на паншчыну, што значна пагаршала іх становішча.

Прыгонная сялянская гаспадарка знаходзілася ў цяжкім эканамічным становішчы. Прычынай былі высокія падаткі і цяжкія ўмовы паншчыны, адсутнасць зацікаўленасці сялян у выніках сваёй працы. У сваю чаргу, гэта значна зніжала даходы землеўладальнікаў.

## Новаўвядзенні Аляксандра I

У гэтых умовах Аляксандр I ажыццявіў новаўвядзенні, накіраваныя на пераадоленне крызісных з'яў у прыгонніцкай сістэме. У 1801 г. быў прыняты ўказ, паводле якога купцы, мяшчане, дзяржаўныя і ўдзельныя сяляне атрымалі права куплі зямлі. Наступным крокам быў «Указ аб вольных хлебаробах» (1803 г.). Паводле гэтага заканадаўчага акта памешчыкі атрымалі права вызваляць прыгонных сялян па адным чалавеку або цэлымі паселішчамі з перадачай ім зямельных участкаў.

За гэта селянін мусіў выплаціць выкуп або выканаць павіннасці. Вызваленых сялян называлі «вольнымі хлебаробамі». Выданне ўказа аб вольных хлебаробах не прынесла таго выніку, на які разлічваў Аляксандр I. Правам адпускаць сялян на волю ў краіне скарысталіся практычна адзінкі. Аднак Указ быў першым законам, у якім гаварылася пра магчымасць вызвалення прыгонных сялян менавіта з зямлёй.

## Рэформа ў дзяржаўнай вёсцы

У **1837 г.** было створана Міністэрства дзяржаўных маёмасцей Расійскай імперыі на чале з П. Д. Кісялёвым, які прапанаваў шэраг мер па паляпшэнні становішча дзяржаўных сялян і, як вынік, павелічэнні даходнасці дзяржаўных маёнткаў. У Беларусі рэалізацыя рэформы пачалася ў 1839 г. падпісаннем «Найвышэй зацверджанай установы аб кіраванні дзяржаўнымі маёмасцямі ў Заходніх губернях і Беластоцкай вобласці» і «Найвышэй зацверджанага палажэння аб люстрацыі дзяржаўных маёмасцей Заходніх губерняў і Беластоцкай вобласці». У выніку рэформы, асобныя мерапрыемствы якой праводзіліся аж да канца 1850-х гг., была пераўтворана сістэма кіравання дзяржаўнай вёскай, створаны органы сялянскага самакіравання, праведзена люстрацыя дзяржаўных маёнткаў, ажыццяўляўся перавод дзяржаўных сялян з паншчыны на чынш, спынялася здача казённых маёнткаў у арэнду, праводзіліся мерапрыемствы па сацыяльнай падтрымцы (адкрыццё школ, бальніц), дзяржаўныя сяляне пераходзілі ў разрад *«вольных вясковых абывацеляў»*.



П. Д. Кісялёў.
Мастак Ф. Кругер.
1851 г.

У выніку рэформы становішча дзяржаўных сялян значна палепшылася, падняўся эканамічны ўзровень дзяржаўных маёнткаў, выраслі даходы дзяржавы. Рэформа насіла прагрэсіўны характар і паклала пачатак адыходу ад састарэлай прыгонніцкай сістэмы з перавагай фальваркава-паншчыннай гаспадаркі.

Успомніце, што такое фальваркава-паншчынная гаспадарка.

## Інвентарная рэформа

Спрыяльныя вынікі рэформы далі падставы спадзявацца, што такім самым чынам можна палепшыць становішча памешчыцкай вёскі. Напачатку 1840-х гг. пачалася падрыхтоўка *інвентарнай рэформы*, якую меркавалася правесці толькі ў заходніх губернях Расійскай імперыі. Для ўрэгулявання павіннасцей і памераў надзелаў памешчыцкіх сялян складаўся вопіс прыватных уладанняў, які называўся *інвентар*. У 1840 г. было выдадзена распара-

**Аграрныя рэформы ў Беларусі ў першай палове XIX ст.**

| Рэформа П. Д. Кісялёва ў дзяржаўнай вёсцы | Інвентарная рэформа ў памешчыцкай вёсцы |
|---|---|
| ***люстрацыя*** (складанне вопісу) усіх дзяржаўных маёнткаў і на яе аснове — дакладнае вызначэнне павіннасцей сялян | увядзенне ***інвентароў*** — абавязковых дакументаў, якія ўключалі апісанне памераў сялянскіх надзелаў і павіннасцей |
| падзел сялян у залежнасці ад памераў іх зямельных надзелаў на 4 разрады — цяглыя, паўцяглыя, агароднікі і бабылі | стварэнне дваранскіх інвентарных камітэтаў |
| спыненне арэнды дзяржаўных зямель і перавод сялян з паншчыны на чынш | |
| правядзенне палітыкі «апякунства» над сялянамі, якая ўключала ў сябе развіццё адукацыі, медыцынскай дапамогі, страхавання, сацыяльнай дапамогі | |
| атрыманне сялянамі права займацца гандлем і промысламі, права на маёмасць і спадчыну | |
| права сялян на самакіраванне | |

джэнне аб увядзенні інвентароў у памешчыцкіх маёнтках, узятых у апеку. Аднак праводзіць вопісы памешчыкі не спяшаліся. У красавіку **1844 г.** было пачата правядзенне інвентарнай рэформы і для ўвядзення абавязковых інвентароў створаны былі губернскія «Камітэты для разгляду і складання інвентароў памешчыцкіх маёнткаў» (інвентарныя камітэты). У выніку ў Заходняй і Цэнтральнай Беларусі інвентарызацыя прайшла больш актыўна, на ўсходзе ж працягвалася аж да канца 1850-х гг., але так і не была завершана. Рэформа памешчыцкай вёскі не мела такога станоўчага эфекту, як у казённых уладаннях, становішча прыватнаўладальніцкіх сялян істотна не змянілася. Правядзенне рэформы сутыкнулася з паўсюдным супрацівам памешчыкаў і не было завершана ў сувязі з пачаткам падрыхтоўкі адмены прыгоннага права.

У часы Мікалая І быў створаны шэраг сакрэтных камітэтаў для прапрацоўкі сялянскага пытання. Вынікам дзейнасці аднаго з іх было падпісанне ўказа аб абавязаных сялянах (1842 г.), які прадугледжваў магчымасць вызвалення сялян па згодзе з памешчыкамі з наданнем ім у карыстанне надзелаў пры ўмове выканання павіннасцей.

У выніку праведзеных у вёсцы мерапрыемстваў сацыяльныя адрозненні паміж памешчыцкімі і дзяржаўнымі сялянамі значна павялічыліся. Становішча прыватнаўладальніцкіх сялян працягвала заставацца цяжкім, у памешчыцкай вёсцы нарастаў крызіс прыгонніцкай сістэмы. У дзяржаўных уладаннях пачаліся пераўтварэнні, скіраваныя на ўрэгуляванне становішча сялян.

### «Прускі» шлях развіцця капіталізму

**2. Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы ў другой палове XIX ст.** Рэформа 1861 г. абумовіла **«прускі» шлях развіцця капіталізму** ў сельскай гаспадарцы. Для яго былі ўласцівыя захаванне памешчыцкага землеўладання, малазямелле сялян, адпрацовачная сістэма гаспадарання (памешчыцкія землі апрацоўваліся інвентаром сялян, якія атрымлівалі за гэта ад памешчыка зямельныя ўгоддзі ў арэнду).

> Ці можна лічыць «прускі» шлях развіцця капіталізму прагрэсіўным? Чаму?

### Аграрная рэформа П. А. Сталыпіна

Напачатку XX ст. сялян Беларусі закранулі пераўтварэнні, якія былі прызначаны падштурхнуць развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы. У 1906 г. іх ініцыятарам выступіў старшыня Савета міністраў Расійскай імперыі **П. А. Сталыпін**. Мерапрыемствы атрымалі назву *сталыпінскай аграрнай рэформы*.

П. А. Сталыпін лічыў, што існаванне сялянскага абшчыннага землеўладання і землекарыстання тармозіць развіццё капіталізму і прадпрымальніцкай ініцыятывы сялянства. Для ліквідацыі перашкод прапаноўвалася дазволіць вольны выхад сялян з абшчыны і стварэнне індывідуальных гаспадарак, якія змяшчаліся б на **хутары** або

> **Хутар** — адасоблены ўчастак зямлі, на які пераносілася сядзіба селяніна, а таксама сельскагаспадарчы інвентар, неабходны для апрацоўкі зямлі.

**Водруб** — адасоблены надзел зямлі, выдзелены з вясковага абшчыннага землекарыстання ў асабістую ўласнасць сялянскай сям'і, але без вынясення сядзібы з вёскі.

**водрубе**. Водруб апрацоўваць было цяжэй, бо ён мог знаходзіцца далёка ад вёскі, патрабаваўся час, каб да яго дабрацца, даставіць туды неабходную тэхніку, інвентар, насенне, пасля ўборкі перавезці ўраджай у вёску і г. д.

Бедныя сяляне атрымалі магчымасць прадаваць свае ўчасткі, больш заможныя маглі ўзяць пазыку ў Сялянскім пазямельным банку для далейшага развіцця сваёй гаспадаркі і куплі зямлі. З гэтай катэгорыі гаспадароў паступова фарміравалася вясковая буржуазія як апора ўлады на вёсцы.

Перасяленне сялян

Для падтрымкі малазямельных і беззямельных сялян П. А. Сталыпін прапанаваў перасяляць іх на вольныя землі на ўсходзе Расійскай імперыі (Сібір, Далёкі Усход, Сярэдняя Азія, Паўночны Каўказ), дзе яны атрымлівалі зямельныя надзелы і магчымасць уладкаваць сваю гаспадарку.

«Амерыканскі» шлях развіцця капіталізму

Сталыпінская аграрная рэформа стварала магчымасці для **«амерыканскага» шляху развіцця капіталізму** ў сельскай гаспадарцы, для якога характэрныя стварэнне хутарскіх гаспадарак, замацаванне зямлі за непасрэдным вытворцам-фермерам, свабодны продаж і купля зямлі, пашырэнне арэнды, выкарыстанне наёмнай працы. Аднак правядзенне гэтай рэформы не было завершана.

Сутнасць аграрнага пытання

**3. Аграрнае пытанне.** Аграрнае пытанне шмат стагоддзяў было ключавым у эканамічным развіцці Беларусі і свету. У многіх краінах аграрны сектар і цяпер з'яўляецца асновай эканомікі. У шырокім разуменні аграрнае пытанне — гэта пытанне аб становішчы і развіцці сельскай гаспадаркі. У другой палове XIX ст. у Беларусі вырашэнне аграрнага пытання было звязана ў першую чаргу з умовамі і магчымасцю развіцця капіталістычных адносін, дзе ключавым было пытанне аб уласнасці на зямлю і яе размеркаванні.

Адмена прыгоннага права як спроба вырашэння аграрнага пытання

Адмена прыгоннага права паслужыла каласальным штуршком у развіцці гэтых працэсаў, паспрыяла фарміраванню класа вясковай буржуазіі і сель-

скагаспадарчых рабочых, фарміраванню капіталізму ў сельскай гаспадарцы. Асаблівасці правядзення аграрнай рэформы на тэрыторыі Беларусі (ільготы сялянам, адмена часоваабавязанага становішча і інш.), магчымасць першымі пераймаць капіталістычныя дасягненні іншых еўрапейскіх дзяржаў зрабілі гэтыя працэсы тут больш актыўнымі, чым шмат у якіх іншых рэгіёнах Расійскай імперыі.

Пераарыентацыя сельскай гаспадаркі

**4. Сусветны аграрны крызіс 80-х гг. XIX ст. і яго ўплыў.** Важным фактарам, які паўплываў на развіццё сельскай гаспадаркі Беларусі і свету, выступіў сусветны эканамічны крызіс 80-х гг. XIX ст. Істотным яго вынікам была пераарыентацыя сельскай гаспадаркі беларускіх губерняў. Традыцыйна асноўнай прадукцыяй сельскагаспадарчай вытворчасці Беларусі былі збожжавыя культуры, якія пераважна ішлі на экспарт, выкарыстоўваліся ў вінакурэнні і іншых вытворчасцях. Аднак значнае паніжэнне цэн на збожжа на рынках Заходняй Еўропы напачатку 80-х гг. XIX ст. з прычыны больш выгадных паставак з Амерыкі, Аўстраліі, чарназёмных рэгіёнаў Расійскай імперыі прымусілі беларускіх землеўладальнікаў шукаць альтэрнатыўныя крыніцы даходу. Сельская гаспадарка Беларусі была пераарыентаваная на мясную і малочную жывёлагадоўлю. У сувязі з развядзеннем жывёлы змяніліся і суадносіны пасеўных плошчаў пад раслінныя культуры — раслі пасевы тэхнічных культур (бульба, буракі, лён, каноплі, кармавыя). Працягвала развівацца вінакурэнне.

Рэгіянальная спецыялізацыя сельскагаспадарчай вытворчасці

Выдзелілася рэгіянальная спецыялізацыя сельскагаспадарчай вытворчасці. У Гродненскай і часткова Мінскай губернях была пашырана авечкагадоўля, у Магілёўскай губерні вырошчвалі каноплі, у Віцебскай і часткова Віленскай губернях — лён, у Мінскай, Гродненскай, Віленскай губернях павялічваліся пасеўныя плошчы пад бульбу.

**Інтэнсіфікацыя сельскагаспадарчай вытворчасці**

У гэты ж час назіраецца інтэнсіфікацыя сельскагаспадарчай вытворчасці, значна расце выкарыстанне ўдасканаленай тэхнікі, назіраецца ўсё больш актыўнае ўкараненне перадавых тэхналогій у сельскую гаспадарку Беларусі.

**Асаблівасці правядзення рэформы 1861 г. у Беларусі**

**5. Асаблівасці правядзення аграрных пераўтварэнняў на тэрыторыі Беларусі: вынікі і наступствы.** У Беларусі правядзенне сялянскай рэформы 1861 г. мела шэраг асаблівасцей у розных рэгіёнах. Правілы, прапісаныя ў «Агульным палажэнні», былі аднолькавыя для ўсіх. «*Мясцовае палажэнне аб пазямельным уладкаванні сялян, пасаджаных на памешчыцкіх землях у губернях вялікарасійскіх, новарасійскіх і беларускіх*» і «*Мясцовае палажэнне аб пазямельным уладкаванні сялян, пасаджаных на памешчыцкіх землях у губернях: Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай,*

## СЯЛЯНСКАЯ РЭФОРМА 1861 г.



*Мінскай і часткі Віцебскай»* усталёўвалі розныя правілы вызначэння велічыні сялянскага надзела, які выкупляўся. Гэта было звязана з існаваннем падворнага землекарыстання на захадзе Беларусі і абшчыннага — на ўсходзе.

Калі ў памешчыка заставалася менш за 1/3 дарэформеннай зямлі або надзел, што выкупляўся селянінам, перавышаў вызначаную норму, памешчык мог правесці адрэзкі ад сялянскіх надзелаў на сваю карысць. Памешчыкі імкнуліся выдзеліць для выкупу сялян менш урадлівыя землі.

**Дадатковыя змены ў правядзенні рэформы 1861 г.**

У 1863 г. для сялян Беларусі былі ўнесены дадатковыя змены ў правядзенне рэформы 1861 г. Звязана гэта было з падзеямі польскага паўстання 1863–1864 гг. З мэтай не дапусціць удзелу сялян у паўстанні ім быў дадзены шэраг ільгот і дадатковых прывілей. Так, ад 1863 г. усе сяляне заходніх губерняў пераводзіліся на выкуп, г. зн. адмянялася часоваабавязанае становішча. Памер выкупных плацяжоў для гэтых сялян быў зніжаны на 20 %. Былі арганізаваныя паверачныя камісіі, якія правяралі, наколькі дакладна складзены *ўстаўныя граматы* і выконваюцца ўмовы правядзення сялянскай рэформы.

> Успомніце, што такое ўстаўная грамата.

**Значэнне рэформы 1861 г.**

Адмена прыгоннага права, нягледзячы на шэраг абмежаванняў, частковае захаванне памешчыцкага землеўладання і стрыманых магчымасцей для сялян, насіла прагрэсіўны характар, спрыяла развіццю капіталістычных адносін і сталася важным крокам на шляху да мадэрнізацыі Беларусі.

**Асаблівасці сталыпінскай аграрнай рэформы**

Правядзенне сталыпінскай аграрнай рэформы на тэрыторыі Беларусі адрознівалася ад цэнтральных рэгіёнаў Расійскай імперыі. Асноўная задача рэформы — ліквідацыя сялянскага абшчыннага землекарыстання і землеўладання. На тэрыторыі Беларусі яно захоўвалася толькі ў Магілёўскай і часткі Віцебскай губерняў (у астатніх было падворнае), таму асноўныя мерапрыемствы рэформы закранулі менавіта гэтыя тэрыторыі.

**Супярэчлівасць вынікаў сталыпінскай аграрнай рэформы**

Хутароў і адрубоў у Беларусі было створана няшмат — 12 % ад усіх сялянскіх двароў. Але варта адзначыць, што гэтая лічба вышэйшая, чым у цэлым па губернях Еўрапейскай Расіі, дзе яна склала 10,6 %. Апроч таго, гэта толькі прамежкавы вынік, бо правядзенне рэформы не было скончана праз пачатак Першай сусветнай вайны. Тым не менш у выніку пераразмеркавання зямельнага фонду колькасць заможных сялян, якія валодалі буйны́мі зямельнымі надзеламі, у Беларусі павялічылася.

> Параўнайце мэты і вынікі сталыпінскай аграрнай рэформы. Прааналізуйце, наколькі пастаўленыя мэты рэформы былі дасягнутыя.

Супярэчлівыя былі і вынікі перасялення сялян на вольныя землі ва ўсходнія рэгіёны Расійскай імперыі. Каля 420–450 тыс. сялян перасяліліся з Беларусі, аднак частка з іх (да 25 %) вярнулася назад. Перад перасяленнем яны прадавалі ўсю сваю маёмасць, таму пасля вяртання папаўнялі шэрагі наёмных рабочых.

**Мэты правядзення сталыпінскай аграрнай рэформы**

| ЭКАНАМІЧНЫЯ | ПАЛІТЫЧНЫЯ |
| --- | --- |
| Пашырэнне капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы, стварэнне вясковай буржуазіі з ліку заможных сялян | Раскол сялянства па маёмаснай прыкмеце, выкарыстанне заможных сялян як апоры для ўрада на вёсцы |
| Выхад сялян з абшчыны і замацаванне за імі зямельнай уласнасці ў выглядзе хутароў ці адрубоў | Перасяленне малазямельных і беззямельных сялян на ўскраіны Расійскай імперыі, зніжэнне сацыяльнай напружанасці ў цэнтральных раёнах |

**Змены ў першай палове XIX ст.**

**6. Змены ў беларускай вёсцы.** Змены, што адбываліся ў беларускай вёсцы на працягу XIX — пачатку XX ст., можна разглядаць як змены ўсяго беларускага грамадства, бо больш за 80 % насельніцтва Беларусі складалі сяляне. XIX ст. было найбольш дынамічным у развіцці беларускай вёскі ў параўнанні з папярэднімі

стагоддзямі. Яшчэ да адмены прыгоннага права дзяржаўныя сяляне атрымалі асабістую свабоду, пачала развівацца сістэма сялянскага самакіравання, з'явілася сацыяльнае забеспячэнне ў вёсцы — медыцына, адукацыя.

**Змены ў выніку аграрнай рэформы 1861 г.**

Аграрная рэформа 1861 г. была наступным крокам, які паўплываў на сацыяльнае і эканамічнае становішча сялян. Значны ўплыў аказала развіццё капіталістычных адносін, якое паскорылася ў другой палове XIX — пачатку XX ст. Менавіта ў гэты час зрабілася больш відавочнай сацыяльная дыферэнцыяцыя сялянскага насельніцтва. Сярод сялян вылучыліся тры маёмасныя групы — заможныя, сераднякі і бедната. Эканамічнае становішча вызначалася наяўнасцю зямлі і цяглай сілы (пераважна коней). На сацыяльнае становішча ўплывала месца ў кіраўніцкай іерархіі валаснога і вясковага праўленняў, узровень адукацыі, шэраг нефармальных характарыстык (асабісты аўтарытэт, наяўнасць асаблівых здольнасцей, эксклюзіўны досвед і да т. п.).

**Змены ў другой палове XIX ст.**

У другой палове XIX ст. на вёсцы фарміравалася сельская буржуазія (як з былых памешчыкаўземлеўладальнікаў, так і з прадстаўнікоў сялянства, пераважна заможнага) і вясковы пралетарыят. Значна актывізаваліся працэсы сацыяльнай і тэрытарыяльнай мабільнасці сялянства. Сяляне сыходзілі на часовыя і сезонныя заробкі, знаходзілі працу ў межах сваіх губерняў, у іншых, у тым ліку аддаленых, рэгіёнах Расійскай імперыі, а таксама за мяжой. Для часткі сялян праца па найме была толькі магчымасцю дадатковага заробку, частка ж сялянскага насельніцтва ператваралася ў вясковы пралетарыят, для якога гэта была асноўная крыніца існавання, частка — знаходзіла працу ў горадзе, папаўняючы лік гараджан. Разам з тым актывізацыя мабільнасці паміж горадам і вёскай дала штуршок мадэрнізацыі вёскі ў бытавым і культурным плане. Шэраг гарадскіх «дасягненняў» і новаўвя-

дзенняў (адзенне, прадметы хатняга побыту, мова, асобныя звычаі і інш.) пранікалі ў вёску праз тых, хто сыходзіў у горад на часовыя заробкі або на навучанне.

### Перасяленчы рух сялян

У канцы XIX — пачатку XX ст. значна павялічыўся перасяленскі рух сялян. Аднак не ўсе перасяленні на свабодныя землі былі паспяховыя. Многія перасяленцы не здолелі ўладкавацца на новым месцы і былі вымушаны вяртацца назад, пераважным чынам папаўняючы шэрагі вясковай беднаты або пралетарыяту.

### Рост увагі да беларускай вёскі

Актывізацыя нацыеўтваральных працэсаў у другой палове XIX — пачатку XX ст. прыцягнула вялікую ўвагу перадавых колаў грамадства да беларускай вёскі. Актыўнае вывучэнне беларускай нацыянальнай культуры і побыту, фальклору, мовы, традыцый не магло не паўплываць і на самасвядомасць сялян, якія паступова ад разумення таго, што яны «тутэйшыя», прыходзілі да ўсведамлення сваёй этнічнай і нацыянальнай прыналежнасці, маглі называць сябе беларусамі.

*У першай палове XIX ст. у сельскай гаспадарцы Беларусі адбываўся працэс разлажэння прыгонніцкай сістэмы і зараджэння буржуазных адносін. Расійскі ўрад правёў шэраг рэформаў. Найбуйнейшай і найважнейшай з іх была адмена прыгоннага права. Значная частка памешчыкаў выступала супраць змен, якія закранալі іх інтарэсы. Працэс рэфармавання адбываўся на працягу ўсяго XIX і пачатку XX ст. Правядзенне аграрных пераўтварэнняў было прагрэсіўнай з'явай і спрыяла развіццю капіталізму ў сельскай гаспадарцы.*

| калі ў свеце... | на тэрыторыі Беларусі... |
|---|---|
| 19 чэрвеня 1865 г. — адмена рабства ў ЗША | 19 лютага 1861 г. — адмена прыгоннага права |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Чаму прыгонніцкая сістэма гаспадарання ў першай палове XIX ст. зазнавала крызіс?
2. У чым заключалася сутнасць рэформаў П. Д. Кісялёва ў дзяржаўнай і памешчыцкай вёсцы? Ці дазволілі гэтыя рэформы пераадолець крызіс прыгонніцкай сістэмы гаспадарання?
3. У чым заключалася аграрнае пытанне? Вызначце шляхі вырашэння аграрнага пытання.
4. Вызначце асаблівасці правядзення сялянскай рэформы 1861 г. на тэрыторыі Беларусі. Чым яны былі абумоўлены? Параўнайце ўмовы атрымання сялянамі зямлі ва ўсходніх і заходніх рэгіёнах Беларусі.
5. Ахарактарызуйце ўплыў сусветнага эканамічнага крызісу 80-х гг. XIX ст. на развіццё сельскай гаспадаркі Беларусі.
6. Вылучыце асноўныя кірункі сталыпінскай аграрнай рэформы. Вызначце асаблівасці і вынікі яе правядзення на тэрыторыі Беларусі. Дакажыце, што рэформа спрыяла развіццю капіталістычнай сістэмы гаспадарання.
7. Ахарактарызуйце змены, якія адбываліся ў беларускай вёсцы на працягу XIX — пачатку XX стст. Вызначце фактары, якія абумовілі гэтыя змены.